# Раздел III
# ОБРАЗОВАТЕЛЬНЫЙ ПОТЕНЦИАЛ НЕМАТЕРИАЛЬНОГО КУЛЬТУРНОГО НАСЛЕДИЯ, ЕГО ИНТЕГРАЦИЯ В СИСТЕМУ ФОРМАЛЬНОГО И НЕФОРМАЛЬНОГО ОБРАЗОВАНИЯ

УДК [069.295+069.4/.5]:008(476)

**А. М. Бухал,**
*загадчык навукова-метадычнага аддзела Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь, г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

## ВЫКАРЫСТАННЕ ПАТЭНЦЫЯЛУ НЕМАТЭРЫЯЛЬНАЙ ГІСТОРЫКА-КУЛЬТУРНАЙ СПАДЧЫНЫ Ў ІНКЛЮЗІЎНЫХ ПРАКТЫКАХ НАЦЫЯНАЛЬНАГА ГІСТАРЫЧНАГА МУЗЕЯ РЭСПУБЛІКІ БЕЛАРУСЬ

**Анатацыя.** *Артыкул прысвечаны метаду выкарыстання нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў працэсе музейнай камунікацыі са слабавідушчымі і невідушчымі наведвальнікамі ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь. Адзначаюцца дадатковыя магчымасці выкарыстання нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў развіцці інклюзіўнай культуры. Прадстаўлена схема пабудовы канцэпцыі інклюзіўнай інтэрактыўнай музейнай прасторы. Падкрэсліваецца значная роля нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны ў сацыяльнай рэабілітацыі і інтэграцыі людзей з інваліднасцю.*

**Ключавыя словы:** *інклюзія, нематэрыяльная гісторыка-культурная спадчына, музейная камунікацыя.*

**A. Bukhal,**
*Head of Research Department, National historical museum of the Republic of Belarus, Minsk, Republic of Belarus*

## APPLICATION OF THE POTENTIAL OF INTANGIBLE HERITAGE IN THE INCLUSIVE PRACTICES OF THE NATIONAL HISTORICAL MUSEUM OF THE REPUBLIC OF BELARUS

**Abstract.** *The article is devoted to the method of using intangible heritage in museum communication for visually impaired and blind visitors of the National Historical Museum of the Republic of Belarus. The author describes the benefits of using intangible heritage in developing an inclusive culture; represents the scheme for creating the concept of an inclusive and interactive museum space. The article highlights the significant role of intangible heritage in social rehabilitation and integration of people with disabilities.*

**Key words:** *inclusion, intangible historical and cultural heritage, museum communication.*

30 ліпеня 2022 г. падпісаны Закон Рэспублікі Беларусь №138-З, які замацоўвае права грамадзян з інваліднасцю на ўдзел у культурным жыцці [5, ст. 6] і гарантуе забеспячэнне роўных магчымасцей у рэалізацыі гэтага права [5, гл. 1, ст. 5]. Таксама гэты дакумент уводзіць паняцце «сацыяльная інтэграцыя» [5, гл. 1, ст. 1] і абараняе ад дыскрымінацыі [5, гл. 1, ст. 7]. Зразумела, што нарматыўны дакумент зафіксаваў палажэнні і падагульніў існуючыя практыкі.

Нацыянальны гістарычны музей Рэспублікі Беларусі згодна з Кодэксам Рэспублікі Беларусь аб культуры [3, арт. 2] адкрыты для ўсіх наведвальнікаў і вядзе сістэмную працу ў інклюзіўным кірунку.

У 2022 г. галоўнай задачай у гэтым кірунку стала інтэграцыя наведвальнікаў з парушэннямі зроку ў музейную камунікацыю. Новы закон таксама зафіксаваў паняцце аўдыядыскрыпцыі [5, гл. 1, ст. 1]. Яна з’яўляецца адным з важных метадаў працы з невідушчымі ці слабавідушчымі наведвальнікамі музеяў любога профілю і вартая асобнай публікацыі.

Мэта артыкула – апісанне інклюзіўнага метаду, распрацаванага ў Нацыянальным гістарычным музеі Рэспублікі Беларусь для інклюзіўнага інтэрактыўнага выставачнага праекта «Гісторыя без межаў».

Выкарыстанне патэнцыялу нематэрыяльнай культурнай спадчыны ў інклюзіўнай дзейнасці музеяў пакуль не асэнсаваны ў спецыяльнай айчыннай літаратуры. Але, безумоўна, сацыяльныя цэнтры і культурныя ўстановы звяртаюцца да яго ў сваіх практыках, таму варта чакаць змястоўных абагульняючых артыкулаў. Лічым, што варта засяроджвацца менавіта на айчынным досведзе з улікам агульный культурнай прасторы.

Інклюзіўны кірунак музейнай працы, па меркаванні аўтара, мае большую эфектыўнасць у тым выпадку, калі гэта праца:

1) *сістэмная*, у адрозненне ад адзінкавых акцый, сістэмная праца ўсталёўвае трывалыя культурныя сувязі;

2) *комплексная* з выкарыстаннем розных форм музейнай камунікацыі, індывідуальных і групавых;

3) *калектыўная*, з улікам магчымых кансультацый спецыялістаў, псіхолагаў, рэабілітолагаў, сацыяльных работнікаў, заснаваная на прынцыпах культуры ўдзелу.

Абавязкова трэба ўлічваць парады і досвед рэабілітолагаў. Уключэнне наведвальнікаў з інваліднасцю ў музейную камунікацыю адбываецца паступова. Лічым, што тут варта пераняць агульныя прынцыпы сацыякультурнай рэабілітацыі. Сярод разнастайнасці мадэляў і канцэпцый прынцыпы паступовасці, сістэмнасці і комплекснасці падзялюцца большасцю даследчыкаў і спецыялістаў [6, с. 7].

Праграма «Уключыся ў Музей!» Нацыянальнага гістарычнага музея Рэспублікі Беларусь рэалізуецца з улікам пазначаных пунктаў. Галоўная мэта праекта «Уключыся ў Музей!» – удасканальванне даступнага асяроддзя і пашырэнне культурна-адукацыйнага кірунку працы музея для наведвальнікаў з інваліднасцю.

У верасні 2022 г. пачаў працу інтэрактыўны інклюзіўны выставачны праект «Гісторыя без межаў», пабудаваны па прынцыпах інтэрактыўнага дызайну, які закладвае аснову прасторавай даступнасці, і без якога складана гаварыць пра інклюзіўныя метады камунікацыі [4, с. 21].

Тэма інтэрактыўнага інклюзіўнага праекта – народныя святы беларусаў. Тэма абрана па шэрагу прычын. Па-першае, шырокая мэтавая аўдыторыя – тэма зразумелая і цікавая практычна для ўсіх груп наведвальнікаў. Гэта важна пры працы ў змешаных групах. Па-другое, тэматычны ахват, які абапіраецца на народны каляндар, дазваляе падтрымліваць актуальнасць выставы ў любы час і прапаноўваць актыўнасці на працягу ўсёй працы выставы, што абумовіць сістэмную працу. Па-трэцяе, лёгкая прыстасаванасць тэмы да інтэрактыўных узаемадзеянняў з наведвальнікамі, што мае асаблівую значнасць у рэчышчы дадзенага артыкула.

Для праекта адмыслова адаптаваны формы музейнай камунікацыі з улікам патрэб наведвальнікаў з парушэннямі зроку. Канцэптуальна праект «Гісторыя без межаў» працуе з дзвума задачамі: з аднаго боку, распавядае пра народны каляндар і абрадавае кола, з другога – стварае прастору для агульнай камунікацыі паміж наведвальнікамі.

Задачы інклюзіўнага выставачнага праекта ставіліся наступныя:

1) стварыць інклюзіўную інтэрактыўную выставачную прастору;

2) прадставіць паслядоўнасць каляндарнай абраднасці беларусаў;

3) скласці комплекснае ўяўленне аб народнай абрадавай традыцыі беларусаў, яе звязанасці і паслядоўнасці;

4) спрыяць выхаванню павагі да народнай культуры праз яе тлумачэнне сродкамі музейнай дзейнасці;

5) павысіць узровень інклюзіўнай культуры праз стварэнне агульнай прасторы для наведвальнікаў розных груп здароўя.

Музейны прадмет з’яўляецца галоўным складнікам музейнай камунікацыі. Галоўны сродак музейнай выразнасці – візуальны. З гэтай

прычыны для наведвальнікаў з парушэннямі зроку і невідушчых наведвальнікаў зварот да нематэрыяльнай спадчыны становіцца найбольш эфектыўным крокам для засваення агульнай культуры як у асобных групах, дзе працуюць толькі наведвальнікі з інваліднасцю, так і ў агульных групах, дзе знаходзяцца наведвальнікі розных груп здароўя.

Звяртаючыся падчас працы да абрадавых гульняў, танцаў і карагодаў, а таксама спеваў выбудоўваецца агульная камунікатыўная прастора. У гэтым і ёсць галоўная мэта праекта. Сутнасць метаду, распрацаванага для выставачнага праекта, заключаецца ў стварэнні агульнай і адзінай выставачнай прасторы праз успрыманне музейных прадметаў і артэфактаў з дапамогай тэкстур матэрыялаў, формы, прасторава-аб’ёмных характарыстык, гуку і вібрацый, а таксама кенетыкі. Метад распрацаваны, абапіраючыся на экспертныя кансультацыі спецыялістаў-рэабілітолагаў грамадскага аб’яднання «Беларускае таварыства інвалідаў па зроку», у рамках праграмы «Уключыся ў Музей!», якая рэалізуецца пры падтрымцы гранта Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь у культуры. Дадатным бокам метаду з’яўляецца стварэнне адаптыўнай мадэлі музейнай камунікацыі для наведвальнікаў рознай групы здароўя.

На бягучы момант асноўным шыракараспаўсюджаным прыёмам інклюзіі ў музеях для невідушчых наведвальнікаў з’яўляецца стварэнне аб’ёмных макетаў, якія часцей за ўсё ствараюцца з пластыка. Але гэта не дазваляе ўспрымаць характарыстыкі прадметаў. Галоўныя хібы гэтага метаду ў тым, што, па-першае, скажаюцца родавыя прыкметы прадмета інтэрпрэтацыі, па-другое, адбываецца штучнае памнажэнне экспазіцыйнага матэрыялу. Такім чынам, наведвальнік успрымае два аб’екты, а музейная прастора быццам падзяляецца на два складнікі: экспазіцыя для відушчых і для невідушчых – гэта падзяляе музей і супярэчыць галоўнаму прынцыпу інклюзіі. Акрамя таго, такі аб’ект павінен суправаджацца дасканалым тыфлакаментаром, што натуральным чынам робіць немагчымым эфектыўную працу з ім з групай больш за 5 удзельнікаў.

Прапанаваны метад дазваляе стварыць інклюзіўнае асяроддзе ў эксклюзіўнай прасторы, праводзіць карэктную музейную медыяцыю, не скажаючы якасныя характарыстыкі музейнага прадмета праз тое, што нематэрыяльная спадчына ў меншай ступені залежная ад прадметнай праявы. Акрамя таго, распрацаваны метад дазваляе рэалізоўваць сацыяльную функцыю музея праз правядзенне інтэрактыўнай камунікацыі на ўзроўні наведвальнік-наведвальнік.

Згодна з класіфікацыяй UNESCO, элементы нематэрыяльнай культурнай спадчыны падзяляюцца на 5 шырокіх катэгорый [2]. Лічым, што гэтыя катэгорыі прымяняюцца не толькі ў сусветным плане, але цалкам маштабуюцца і для асобных культур асобных краін. Пералічым іх.

1. Вусная традыцыя і формы самапрэзентацыі, у тым ліку мова як носьбіт нематэрыяльнай культурнай спадчыны.

2. Выканальніцкае майстэрства.
3. Звычаі, абрады, святы.
4. Веды і звычаі, якія адносяцца да прыроды і свету.
5. Веды і практыкі, звязаныя з традыцыйнымі рамёствамі.

У межах працы інклюзіўнага выставачнага праекта выкарыстаны наступныя аб'екты нематэрыяльнай гісторыка-культурнай спадчыны: беларускае мастацтва выцінанкі, народная гульня моладзі «Яшчар», мясцовыя песенныя стылі, Велікодны карагод.

На верасень 2022 г. у Дзяржаўным спісе гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь пазначана 164 аб'екты нематэрыяльнай спадчыны [1]. Кожны з іх прыдатны для адаптацыі ў музейнай камунікацыі. Застаецца толькі рэалізоўваць іх патэнцыял у паступовай і сістэматызаванай працы. Далучэнне ўсіх наведвальнікаў музеяў да гісторыка-культурнай спадчыны паспрыяе яе асэнсаванаму захаванню.

## СПІС ВЫКАРЫСТАНЫХ КРЫНІЦ

*1.* Дзяржаўны спіс гісторыка-культурных каштоўнасцей Рэспублікі Беларусь [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: http://gosspisok.gov.by/Home/Index. – Дата доступу: 03.10.2022.

*2.* Использование потенциала нематериального культурного наследия для построения прочного мира [Электронный рэсурс]. – Режим доступа: https://www.unesco.org/ru/articles/ispolzovanie-potenciala-nematerialnogo-kulturnogo-naslediya-dlya-postroeniya-prochnogo-mira-0. – Дата доступа: 03.10.2022.

*3.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс]. – Рэжым доступу: https://etalonline.by/document/?regnum=hk1600413. – Дата доступу: 03.10.2022.

*4.* Комплексное приспособление музеев для инвалидов различных категорий : метод. пособие по социокультурной реабилитации инвалидов музейными средствами / под общ. ред. директора Государственного Дарвиновского музея, д-ра пед. наук А. И. Клюкиной. – М. : ГДМ, 2016. – 140 с.

*5.* О правах инвалидов и их социальной интеграции: Закон Респ. Беларусь от 30 июня 2022 г., №183-3. – Режим доступа: https://etalonline.by/document/?regnum=h12200183. – Дата доступа: 03.10.2022.

*6. Халикова, Д. Р.* Социокультурная инклюзия: концептуальные основы и тенденции развития / Д. Р. Халикова, Е. В. Хилькевич // Аутизм и нарушение развития. – 2022. – Т. 20. – № 2. – С. 4–12.